ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
14
ЛЮТАГА
ЧАЦВЕР
№ 5 (1455)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт
## Тэлетайп
*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### Газета

«Беларускі універсітэт» па выніках рэспубліканскага конкурсу «Спартыўнае пяро-84» за актыўную работу па прапагандзе масавай фізічнай культуры і спорту ўзнагароджана дыпломам рэдакцыі газеты «Фізкультурнік Беларусі».

А. ПАДАЛКА,
супрацоўніца
аддзела навукова-
тэхнічнай інфармацыі

### Па ініцыятыве

ўдзельнікаў Усесаюзных справаздачна-выбарных канферэнцый замежных навучэнцаў, якія праходзілі ва універсітэце з 1 па 5 лютага, адбыўся антываенны мітынг. Удзельнікі яго выказалі падтрымку міралюбівай палітыцы Савецкай дзяржавы. Пры абмеркаванні адказу Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР К. У. Чарненкі на пытанні канадскай студэнткі Лары Перо выступілі студэнты з Конга, Ірака, Калумбіі, Амана, Народнай Дэмакратычнай Рэспублікі Йемен.

В. ШАДУРСКІ,
намеснік сакратара
камітэта камсамола
па інтэрнацыянальнаму
выхаванню.

### Аб стане і мерах

па далейшаму паляпшэнню кантролю за якасцю падрыхтоўкі спецыялістаў на механіка-матэматычным і юрыдычным факультэтах ішла размова на чарговым пасяджэнні рэктарата БДУ імя У. І. Леніна.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### Працягваюцца гульні

чэмпіяната БССР па баскетболу. Лідэрам з'яўляецца каманда «Буравеснік», за якую выступаюць баскетбалісткі універсітэта і ІФК. На ачко адстае дубліруючы састаў «Гарызонта», у радах якога чатыры спартсменкі універсітэта.

І. УЛАДЗІМІРАЎ.

## КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ



*ЯШЧЭ Ў ШКОЛЬНЫЯ гады Інэса Краўчанка вырашыла стаць педагогам: фізікам ці матэматыкам. Магчыма, у выбары прафесіі пэўную ролю адыграла вучоба дзяўчыны ў спецыялізаванай школе з фізічным ухілам. Сёння Іна з удзячнасцю ўспамінае настаўнікаў.*

*«Іна — камсамолка, здольная захапіць, аб'яднаць студэнтаў агульнай справай. Умее добра арганізаваць любое масавае мерапрыемства»,— расказвае пра І. Краўчанка яе сяброўка Наташа Біруля. Таму і даверылі Інэсе абавязкі намесніка сакратара камітэта камсамола механіка-матэматычнага факультэта па маральна-эстэтычнаму выхаванню. Работа на факультэце закіпела. Арганізаваныя пад кіраўніцтвам Іны вечары спадабаліся студэнтам. Асабліва запомніўся факультэцкі навагодні баль.*

*Не забывае, вядома, дзяўчына і пра вучобу: здае экзамены толькі на выдатна і добра.*

*Асабліва высока ацэнена вучоба і камсамольская работа Іны Краўчанка, студэнткі 2-га курса механіка-матэматычнага факультэта, сёлета. Яна вылучана кандыдатам у дэпутаты Маскоўскага раённага Савета народных дэпутатаў.*




Фота А. ВАЛОШЫНА.

## КААРДЫНАТЫ ПОШУКУ

# ПРЫЗНАНЫ ПЕРАМОЖЦАМІ

Падведзены вынікі VII агляду-конкурсу на лепшую навукова-даследчую работу сярод маладых вучоных Белдзяржуніверсітэта.

— На заключны этап конкурсу было рэкамендавана 18 работ у галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, грамадскіх дысцыплін,— расказвае намеснік старшыні савета маладых вучоных універсітэта, кандыдат хімічных навук П. Жук.— Лепшымі прызнаны толькі шэсць. Іх аўтары — маладыя выкладчыкі, аспіранты, навуковыя супрацоўнікі — плённа працуюць над выкананнем навукова-практычных задач, прадугледжаных планам развіцця народнай гаспадаркі нашай рэспублікі.

Нягледзячы на параўнальна нядаўнюю самастойную прафесійную дзейнасць, многія пераможцы з'яўляюцца аўтарамі унікальных распрацовак, вынаходніцтваў, за якімі — новыя перспектывы навукі, яшчэ больш інтэнсіўнае выкарыстанне яе дасягненняў на практыцы.

Так, ужо сёння на аснове даследаванняў, атрыманых кандыдатам геаграфічных навук А. Вітчанка ў галіне агракліматычнага забеспячэння сельскагаспадарчай вытворчасці, вырашаецца праблема ўраджайнасці культур, якія вырошчваюцца на глебах Беларусі.

Агульнасаюзнае і міжнароднае прызнанне атрымала новая методыка тэхналагічных працэсаў у галіне мікраэлектронікі, якую распрацавалі маладыя вучоныя НДІ ПФП кандыдаты фізіка-матэматычных навук В. Грыгор'еў, Н. Даўнаровіч, В. Кіслый і А. Паўлаў. Укараненне яе на адным з прамысловых прадпрыемстваў Мінска дазволіла атрымаць значны эканамічны эфект.

Высока ацэнена работа аспіранта кафедры ядзернай фізікі І. Арабея. Прапанаваная ім прылада аўтаматычнага кантролю расходу гаручага будзе неабходнай у рабоце аўтатранспарту.

Навукова арыгінальнымі прызнаны даследаванні кандыдата хімічных навук М. Франкеля ў галіне энергетычных рэжымаў, малодшага навуковага супрацоўніка кафедры ФПМ С. Гняўко, выкладчыка кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі М. Жбанкова. Іх работы таксама названы лепшымі, а маладыя вучоныя сталі пераможцамі прайшоўшага агляду-конкурсу, узнагароджаны грашовымі прэміямі рэктарата.

І. ТОЎСЦІК

## ЛЮТЫ: НА ПАРАДАК ДНЯ КАМСОРГА

# ЗВЕРЫМ ПЛАНЫ

ПАЧЫНАЕЦЦА новы семестр. Пачынаюцца новыя клопаты ў тваім камсамольскім жыцці. Каб дапамагчы ў рабоце, для цябе, камсорг, у нашай газеце адкрываецца новая рубрыка «На парадак дня камсорга». Матэрыялы, змешчаныя тут, дапамогуць табе акрэсліць асноўныя мерапрыемствы месяца. Парады, дадзеныя адказнымі работнікамі камітэта камсамола універсітэта, будуць карыснымі пры складанні тваіх планаў на месяц.

ПРАЙШЛО ўжо даволі багата часу, як ты здаў апошні ў зімнюю сесію экзамен, засталіся ў мінулым і цудоўныя дні зімовых канікулаў, ты ўжо настроіўся на вучэбны лад, але ўсё ж давай вернемся ў семестр мінулы. Якія адзнакі стаяць у тваёй залікоўцы, у залікоўках камсамольцаў тваёй групы? Прынцыповая размова аб галоўным абавязку студэнтаў — вучобе — павінна стаць цэнтральнай на камсамольскім сходзе лютага.

У лютым адбудзецца і традыцыйны семінар камсоргаў акадэмічных груп. Ты, камсорг, ужо вырашыў, з якімі прапановамі, ідэямі прыйдзеш на яго? А магчыма ты падзелішся вопытам сваёй работы?

А яшчэ табе цікава будзе даведацца, што ў лютым пачынае сваю работу метадычны цэнтр пры школе камсамольскага актыву. Заўсёды, калі ў цябе ўзнікне тое ці іншае пытанне, і магчыма проста захочаш даведацца аб якім-небудзь напрамку камсамольскай работы, ты зможаш звярнуцца ў аўдыторыю № 311 галоўнага корпуса. Іменна тут і будзе размешчаны метадычны цэнтр. У саставе яго чатыры аддзелы: аддзел унутрысаюзнай работы (для сакратароў і членаў камітэтаў камсамола), агульны аддзел (матэрыял па кожнаму напрамку работы ў камітэце камсамола), архіўны аддзел (матэрыял па гісторыі камсамольскай арганізацыі універсітэта), аддзел сувязей паміж ВНУ.

Усё бліжэй і бліжэй да нас той дзень, калі моладзь планеты збярэцца ў Маскве на XII Сусветны фестываль. Вывучэнне гісторыі фестывальнага руху, сустрэчы з дэлегатамі мінулых маладзёжных форумаў, актыўны ўдзел у працоўных акцыях — усе гэтыя мерапрыемствы стануць тваім укладам у дастойную сустрэчу фестывалю.

У камсамольскіх арганізацыях рэспублікі працягваецца Усесаюзны месячнік абаронна-масавай работы. Ці ўсе камсамольцы тваёй групы актыўна ўключыліся ў яго?

# САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

## *КАЛЕКТЫВУ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА НА 1985 ГОД*

АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЧЫ рашэнні XXVI з'езда КПСС, наступных Пленумаў ЦК КПСС, калектыў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна шырока разгарнуў сацыялістычнае спаборніцтва за выкананне і перавыкананне планаў адзінаццатай пяцігодкі, прынятых сацыялістычных абавязацельстваў і далейшае якаснае паляпшэнне ўсіх відаў сваёй дзейнасці.

Выкладчыкі, студэнты, навуковыя супрацоўнікі, рабочыя і служачыя універсітэта, аднадушна адабраючы ўнутраную і знешнюю палітыку нашай партыі, яе нястомныя клопаты аб развіцці Савецкай дзяржавы і ўмацаванні магутнасці нашай Радзімы, рыхтуюцца да дастойнай сустрэчы знамянальнай даты — 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Ажыццяўляючы актыўную падрыхтоўку да XXVII з'езда КПСС, мабілізуючы ўсе сілы на стварэнне грунтоўнай базы для плённай работы ў XII пяцігодцы, калектыў універсітэта накіроўвае свае намаганні на:

— павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, здольных вырашаць праблемы паскоранага навукова-тэхнічнага прагрэсу, і павелічэнне ўкладу БДУ імя У. І. Леніна ў развіццё народнай адукацыі рэспублікі ў святле патрабаванняў, што вынікаюць з пастановы ЦК КПСС «Аб асноўных напрамках рэформы агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы»;

— забеспячэнне далейшага развіцця фундаментальных і прыкладных даследаванняў у галіне грамадскіх, прыродазнаўчых і гуманітарных навук, умацоўваючы сувязь навукі з вытворчасцю;

— удасканаленне вучэбна-метадычнай работы, укараненне навуковых прынцыпаў арганізацыі вучэбнага працэсу, выкарыстанне ў ім навейшых дасягненняў, тэхнічных сродкаў навучання і вылічальнай тэхнікі;

— удасканаленне форм і метадаў камуністычнага выхавання і фарміравання актыўнай жыццёвай пазіцыі ў студэнцкай моладзі;

— далейшае ўмацаванне працоўнай дысцыпліны, парадку і арганізаванасці, павышэнне адказнасці кадраў за даручаную справу.

Удзельнічаючы ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве, калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна прымае на 1985 год наступныя сацыялістычныя абавязацельствы:

1. Выканаць план прыёму і выпуску спецыялістаў па дзённай, вячэрняй і завочнай формах навучання і па аспірантуры.

2. Абараніць 8 доктарскіх і не менш за 80 кандыдацкіх дысертацый.

3. Падрыхтаваць да выдання і выдаць не менш чым 23 падручнікі і вучэбныя дапаможнікі і 220 метадычных распрацовак.

4. Дабіцца, каб колькасць дыпломных работ студэнтаў дзённай формы навучання, рэкамендаваных да ўкаранення і друку, склала не менш чым 36 працэнтаў.

5. Выканаць НДР на агульную суму не менш за 12,5 мільёна рублёў. Атрымаць эканамічны эфект ад укаранення закончаных НДР не менш чым 16 мільёнаў рублёў.

6. Арганізаваць і правесці адну Усесаюзную, адну рэспубліканскую і 9 універсітэцкіх навуковых і навукова-метадычных канферэнцый.

7. Прадоўжыць распрацоўку 14 навуковых тэм, звязаных з рэалізацыяй Харчовай праграмы СССР. Для аказання непасрэднай дапамогі сельскай гаспадарцы рэспублікі накіраваць на сельскагаспадарчыя работы не менш за 3000 студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў і адпрацаваць у калгасах і саўгасах не менш за 100 тысяч чалавека-дзён, у тым ліку і ў падшэфным саўгасе «Гарадок».

8. Падаць у Дзяржкамітэт па адкрыццях і вынаходніцтвах не менш за 300 заявак і атрымаць на раней пададзеныя заяўкі не менш за 200 станоўчых рашэнняў.

9. Прадставіць на Усесаюзны і рэспубліканскі конкурсы не менш за 320 студэнцкіх навуковых работ.

10. Падрыхтаваць да друку не менш за 280 артыкулаў у сааўтарстве са студэнтамі.

11. Падрыхтаваць не менш за 3200 дакладаў студэнтаў на навуковых канферэнцыях.

12. Забяспечыць падрыхтоўку на ФГП не менш за 2000 студэнтаў.

13. Сфарміраваць зводны студэнцкі будаўнічы атрад кLькасцю не менш за 2000 чалавек. Асвоіць сіламі зводнага студэнцкага атрада не менш за 2,5 мільёна рублёў капіталаўкладанняў.

14. Арганізаваць і правесці 26 паходаў моладзі, выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў па месцах баявой і працоўнай славы савецкага народа з удзелам у іх не менш за 300 чалавек.

15. Прачытаць для насельніцтва 8600 лекцый на грамадска-палітычныя і навуковыя тэмы.

16. Падрыхтаваць 5 майстроў спорту, 30 кандыдатаў у майстры спорту, не менш за 120 спартсменаў 1 разрада і не менш за 5000 спартсменаў масавых разрадаў.

17. Падрыхтаваць не менш за 2300 значкістаў комплексу ГПА.

18. Выканаць наменклатурныя мерапрыемствы па ахове працы на суму 40 тысяч рублёў.

19. Сэканоміць 122 тысячы кілават-гадзін электраэнергіі.

20. Выканаць план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы піянерскага лагера і арганізаваць адпачынак на менш чым 250 дзяцей супрацоўнікаў.

*Сацыялістычныя абавязацельствы прыняты на канферэнцыі працоўнага калектыву універсітэта 8 лютага 1985 года.*

*ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЕ*

# ПАМНАЖАЦЬ НАМАГАННІ

ПАДВОДЗЯЧЫ вынікі сацыялістычнага спаборніцтва за мінулы год, нам патрэбна менш гаварыць аб дасягненнях, якія бясспрэчныя і не выклікаюць ні ў каго сумненняў, а спыніцца на нявырашаных пытаннях, праблемах і пошуках шляхоў іх вырашэння.

Планам і сацыялістычнымі абавязацельствамі на 1984 год прадугледжвалася падрыхтаваць і выпусціць 2754 спецыялісты, у тым ліку па дзённай форме навучання 1754 чалавекі. Фактычна выпуск склаў 2699 чалавек (на 55 чалавек менш, чым па плану), а па дзённай форме навучання — 1720 чалавек (на 34 чалавекі менш, чым па плану). Такім чынам універсітэт у мінулым годзе не выканаў свой план і не справіўся з выкананнем адной з галоўных умоў Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва. Такое становішча, зразумела, не можа нас задавальняць. Патрэбна прыняць рашучыя меры супраць хранічнай хваробы ў практыцы вучэбна-выхаваўчага працэсу, падпарадкаваць усю арганізатарскую і выхаваўчую работу выкананню плана выпуску спецыялістаў.

Пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва за 1984 год склалася ўражанне, што нашы універсітэцкія службы, дэканаты, кафедры вельмі дрэнна арыентаваны ў планавых заданнях, у тым ліку і па выпуску спецыялістаў.

Практыка нашай работы і па некаторых іншых важных планавых заданнях таксама недасканалая, а часам нават не вытрымлівае крытыкі. Гэта адносіцца, напрыклад, да плана размеркавання маладых спецыялістаў, плана падрыхтоўкі кандыдатаў і дактароў навук, плана набору і выпуску аспірантаў. Гэтыя планы і сацыялістычныя абавязацельствы ці не напружаныя, ці далёкія ад рэальных умоў.

Ва ўмовах відавочных дэфектаў планавання сацыялістычнае спаборніцтва зніжае сваё значэнне як механізм, які мабілізуе калектыў на дасягненне максімальна высокіх паказчыкаў у рабоце. Таму арганізатары сацыялістычнага спаборніцтва — агульнауніверсітэцкая камісія па сацспаборніцтву і вытворча-масавая камісія прафкома — сумесна з адміністрацыяй павінны навесці парадак і ў сістэме планавання, распрацоўцы сацыялістычных абавязацельстваў на аснове планаў і ў бягучым кантролі за выкананнем планаў і абавязацельстваў. Было б мэтазгодным у 1985 годзе правесці падрыхтоўчую работу аддзеламі і службамі універсітэта разам з грамадскімі камісіямі, якія займаюцца пытаннямі сацыялістычнага спаборніцтва, па пераходу ў XII пяцігодцы ад руціннай да аўтаматызаванай сістэмы кіравання планавымі паказчыкамі і сацспаборніцтвам факультэтаў і кафедраў. Такі вопыт ужо ёсць у перадавых ВНУ краіны, і мы павінны на яго арыентавацца.

Вынікі выканання сацыялістычных абавязацельстваў за мінулы год паказваюць, што універсітэт з усімі астатнімі абавязацельствамі, за выключэннем ужо адзначаных, цалкам справіўся. Прычым у выніку выканання абавязацельстваў дасягнуты значны рост прадукта нашай агульнай працы. 11 доктарскіх дысертацый супрацоўнікаў БДУ — гэта больш чым палова падрыхтаваных дактароў у сістэме МінВНУ БССР; 101 кандыдат, падрыхтаваны ў БДУ,— гэта трэцяя частка падрыхтаваных усімі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Агульны аб'ём выкананых навукова-даследчых работ склаў 12,7 млн. руб. (з 40 млн. па МінВНУ). Эканамічны эфект ад укаранення НДР склаў 19 млн. руб. (па МінВНУ 65 млн. руб.).

Выкладчыкі і навуковыя супрацоўнікі падалі 396 заявак на вынаходніцтвы, атрымалі 231 станоўчае рашэнне. Выдадзены 24 падручнікі і вучэбныя дапаможнікі і 251 метадычная распрацоўка. Аднак не было прэстыжных для універсітэта саюзных выданняў.

Усё гэта сведчыць аб тым, што па выніках работы за 1984 год універсітэт яшчэ больш умацаваў свае пазіцыі цэнтра перадавой навуковай і навукова-метадычнай думкі ў рэспубліцы.

Гаворачы пра вынікі спаборніцтва, нельга не назваць і імёны выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў і студэнтаў, чые работы атрымалі шырокае прызнанне, адзначаны высокімі ўзнагародамі ў 1984 годзе. Гэта загадчык кафедры прафесар І. К. Лапацін, якому прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР за падручнік «Асновы заагеаграфіі», дырэктар НДІ ПФП прафесар А. Ф. Чарняўскі, загадчык лабараторыі А. М. Мухарскі, старшы навуковы супрацоўнік А. І. Тарнапольскі, якія атрымалі прэмію Савета Міністраў СССР за распрацоўку і ўкараненне аўтаматызаванай сістэмы навучання. Манаграфія доктара навук І. А. Малевіча «Метады і электронныя сістэмы аналізу аптычных працэсаў» прададзена па ліцэнзіі для выдання за мяжой. Супрацоўнікам фізфака І. Я. Дубоўскай і В. В. Ціхаміраву за навуковыя працы прысуджаны прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа ўдастоена кніга Д. Я. Бугаёва «Талент і праца». Студэнт мехмата Ю. Дракахруст удастоены залатога медаля АН СССР.

Уклад нашых асобных падраздзяленняў у канчатковыя рэзультаты дзейнасці універсітэта розны і яшчэ даволі нераўназначны. У адпаведнасці з прынятымі ўмовамі і методыкай падвядзення вынікаў спаборніцтва вытворча-масавая камісія прафкома і універсітэцкая камісія правялі параўнаўчую ацэнку дзейнасці факультэтаў па ўсіх асноўных напрамках іх работы.

На аснове параўнаўчых ацэнак 1-е месца па выніках спаборніцтва заняў фізічны факультэт. Вяртанне фізфака ў лідэры спаборніцтва — з'ява заканамерная. Факультэт мае вялікі матэрыяльна-тэхнічны і кадравы патэнцыял, каб паспяхова вырашаць задачы, што стаяць перад ім. Акрамя таго, крытыка, якая была адрасавана факультэту ў мінулым годзе, правільна ўспрынята кіраўніцтвам і грамадскімі арганізацыямі.

Другі год запар высокія пазіцыі па ўсіх асноўных паказчыках работы захоўвае юрыдычны факультэт. Тут хочацца адзначыць, што і гуманітарны факультэт па паказчыках спаборніцтва не толькі можа скласці моцнае саперніцтва ў працы і творчасці прыродазнаўчым факультэтам, але і трывала заняць месца сярод пераможцаў.

Зноў, пасля некаторай паўзы, сярод пераможцаў спаборніцтва мы бачым і біялагічны факультэт, які рэзка палепшыў колькасныя і якасныя паказчыкі і асабліва па навуковай рабоце.

Наступныя месцы размеркаваліся так:

4 месца — факультэт радыёфізікі і электронікі;
5 — мехмат;
6—7 — гістфак і хімфак;
8—9 — геафак і філфак;
10—11 — ФПМ і журфак.

Насцярожвае спад агульных паказчыкаў работы на факультэтах прыкладной матэматыкі і журналістыкі, якія не так даўно займалі прызавыя месцы па выніках спаборніцтва. Асобна патрэбна сказаць і пра гістарычны факультэт, на якім ёсць вялікія рэзервы павышэння эфектыўнасці работы, аднак яны дрэнна выкарыстоўваюцца. Сапраўды, факультэт займае першае месца па аднаму з галоўных напрамкаў работы — па падрыхтоўцы кадраў і павышэнню кваліфікацыі. Разам з тым, па раздзелах навукова-метадычнай, навукова-даследчай, грамадска-палітычнай і арганізацыйна-масавай работы факультэт не здолеў падняцца вышэй восьмага месца.

Сярод кафедраў 1-е месца заняў калектыў кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, 2-е — калектыў кафедры педагогікі, 3-е — калектывы кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму і кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў. Сярод пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва таксама калектыў кафедры замежных моў.

Год 1985 знамянальны падзеяй сусветна-гістарычнага значэння — 40-годдзем Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Ва універсітэце актыўна разгарнулася падрыхтоўка да 40-годдзя Вялікай Перамогі, з кожным днём набірае сілу спаборніцтва за дастойную сустрэчу гэтай слаўнай даты, шырацца рады яго ўдзельнікаў. Усе мы павінны ўсведамляць, што выкананне планавых заданняў і сацыялістычных абавязацельстваў 1985 года, добрасумленная праца, арганізаванасць і дысцыплінаванасць — не толькі грамадзянскі абавязак, але і патрыятычны доўг перад Радзімай.

Упор на практычныя справы па рэалізацыі рашэнняў XXVI з'езда КПСС, планавых заданняў і сацыялістычных абавязацельстваў гэтага года і XI пяцігодкі ў цэлым — вось што вызначае зараз характар і змест вытворчай, арганізатарскай і ідэйна-выхаваўчай работы працоўнага калектыву універсітэта.

**У. ШАЛАТОНІН,**
**старшыня прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў.**

*АДБЫЛАСЯ канферэнцыя працоўнага калектыву БДУ імя У. І. Леніна. На ёй абмеркаваны вынікі сацыялістычнага спаборніцтва за 1984 год і задачы калектыву універсітэта па дастойнай сустрэчы 40-годдзя Вялікай Перамогі, XXVII з'езда КПСС і паспяховаму завяршэнню XI пяцігодкі.*

*На канферэнцыі былі прыняты сацыялістычныя абавязацельствы калектыву універсітэта на 1985 год.*

СТУДЭНТ І НАВУКА

# КОНКУРС ЗАКОНЧЫЎСЯ, КОНКУРС ПРАЦЯГВАЕЦЦА

**У дні зімовых канікулаў вялікая група студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі адправілася ў сталіцу Савецкай Татарыі — горад Казань, дзе прыняла ўдзел у канферэнцыі лаўрэатаў X Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху.**

Вялікі, павучальны вопыт уцягнення студэнцкай моладзі ў даследчы пошук па грамадска-палітычнай тэматыцы назапасілі камсамольскія арганізацыі і выкладчыцкія калектывы вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. У шэрагу ВНУ, і перш за ўсё ў Беларускім, Гомельскім, Гродзенскім універсітэтах, Беларускім тэхналагічным і політэхнічным, Віцебскім ветэрынарным, Магілёўскім педагагічным інстытутах, Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, у падрыхтоўцы конкурсных работ удзельнічаюць практычна ўсе студэнты. А ў цэлым па рэспубліцы ў X Усесаюзным конкурсе прымалі ўдзел 98,3 працэнта студэнтаў дзённай формы навучання.

Лепшыя з лепшых студэнцкіх работ, прайшоўшы вузаўскі, абласны і рэспубліканскі этапы конкурсу, былі пададзены на заключны тур. Іх рэцэнзавалі вядомыя грамадазнаўцы і давалі ацэнку, як правіла, самую высокую. У выніку ў ліку лаўрэатаў X Усесаюзнага конкурсу аказаліся 46 студэнтаў беларускіх ВНУ. Прычым характэрна, што 17 з іх вучацца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Дарэчы, большую колькасць лаўрэатаў маюць толькі дзве ВНУ краіны: Кіеўскі універсітэт і Ваенна-палітычная акадэмія імя У. І. Леніна.

Назавём тых студэнтаў, якія дабіліся найбольш значных поспехаў. Гэта ў першую чаргу выхаванцы Беларускага універсітэта Уладзімір Семянькоў і Ірына Крох, удастоеныя за свае работы дыпломаў першай ступені.

Аб'ектам даследавання Уладзімір Семянькоў выбраў davoлі складаную тэму — «Светапоглядныя перадумовы фарміравання сацыяльнага ведання».

Высокі навуковы ўзровень, бясспрэчная актуальнасць — такое заключэнне зрабіла конкурснае журы аб рабоце Ірыны Крох па тэме «Брыгадная форма арганізацыі працы як праяўленне дзеяння закона перамены працы». Разам са сваёй вучаніцай радасць поспеху раздзяляе сёння і яе навуковы кіраўнік — дацэнт кафедры палітычнай эканоміі гуманітарных факультэтаў Аляксандр Аляксеевіч Кузьмічоў.

Асабліва прыемна адзначыць, што ў ліку лаўрэатаў конкурсу ёсць юнакі і дзяўчаты з замежных краін, што вучацца ў навучальных установах Мінска. Гэта Алена Балцарава з ЧССР, Утэ Брайтэр з ГДР, кубінцы Матос Хасэ, Карлас Авіла, Раберто Лопес, маладыя ліванцы Махамад Азіз, Абдул Саід, Салам Рамал і Маруан Эль-Сабаг.

Сёння ў вышэйшых навучальных установах разгортваецца работа па арганізацыі чарговага, XI Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, якія прысвечаны 40-годдзю Вялікай Перамогі і XII Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў. Забяспечыць правядзенне конкурсу на высокім узроўні — у гэтым важнейшы абавязак камітэтаў камсамола і ўсіх грамадазнаўцаў вышэйшай школы.

**В. САБАЛЕЎСКІ,**
**інструктар аддзела студэнцкай моладзі ЦК ВЛКСМ.**

РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!



*З ДОБРЫМ НАСТРОЕМ пачала вучобу ў гэтым семестры студэнтка 4-га курса біялагічнага факультэта Галіна Вегера. У яе залікоўцы толькі выдатныя адзнакі.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*

НАСУСТРАЧ 40-ГОДДЗЮ ПЕРАМОГІ

# ТРЭЦІ СЕМЕСТР ПАЧЫНАЕЦЦА СЁННЯ

— ТЫ ЯК МЯРКУЕШ правесці канікулы?

— Буду працаваць у будатрадзе.

— Я пра зімовыя пытаю.

— Так, на зімовых...

Сведкай дыялога такога зместу вы маглі б стаць, наведаўшы ў апошнія дні экзаменацыйнай сесіі Беларускі дзяржаўны універсітэт. Але, згадзіцеся, гучыць гэта не зусім звыкла: «зімовы студэнцкі будаўнічы атрад». Ініцыятыва яго стварэння нарадзілася ў камітэце камсамола механіка-матэматычнага факультэта. Яе падтрымалі ў іншых камсамольскіх арганізацыях універсітэта.

Мехмат шэфствуе над шпіталем для інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, што ў Бараўлянах пад Мінскам. Да Дня Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту павінен раскрыць свае дзверы новы лячэбны корпус. Ён і стаў на час зімовых канікулаў будаўнічай пляцоўкай зводнага студэнцкага атрада. Аб'ект падрыхтаваны да здачы, тут ужо вяліся аддзелачныя работы — і справа знайшлася ўсім.

У першы ж дзень выдалі «спецвопратку» — непатрэбныя бальнічныя халаты. Вядома, не будатрадаўская форма, але гэта акалічнасць не паўплывала на сам змест працы. А яе, працы, было нямала. Хлопцы займаліся абсталяваннем палат, дзяўчаты — прыбіралі іх.

Праўда, камандзір атрада студэнт чацвёртага курса хімічнага факультэта Яўген Навумовіч быў больш сціплым у ацэнцы зробленага яго атрадам, маўляў, дапамагалі як маглі. Але, згадзіцеся, без гэтай дапамогі нялёгка прыйшлося б і будаўнікам, і медперсаналу.

Аднак, думаецца, дзейнасць атрада нельга вымяраць толькі колькасцю вымытых вокнаў і перанесеных тумбачак. Немалая частка байцоў — першакурснікі. Для іх гэта [illegible]лівая спроба сіл перад трэцім працоўным семестрам. І самае адметнае: усе студэнты праверку справай вытрымалі на «выдатна». Што пацвердзілі і самі першакурснікі: Сяргей Грынкевіч з гістарычнага, Павел Сенін з хімічнага, Жанна Сіўко і Каця Граковіч з механіка-матэматычнага факультэтаў.

Усе байцы зімовага атрада засталіся задаволеныя зробленым выбарам. З асаблівым гонарам кожны баец імкнуўся падкрэсліць, што працуюць яны бязвыплатна.

**В. ГРАМОВІЧ.**
наш кар.

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА







**15 лістапада мінулага года ў газеце быў надрукаваны праблемны артыкул «Некалькі «за» на фоне нерашучасці», які ставіў пытанне аб сумяшчэнні вучобы студэнтаў з іх працай на прадпрыемствах. «Запрашаліся да дзеяння» усе зацікаўленыя фарміраванні з мэтай дапамагчы студэнту не толькі знайсці работу, але і арганізаваць яе. Даводзім да ведама чытачоў вынікі дзеянняў камітэта камсамола універсітэта па прапановах артыкула «Некалькі «за» на фоне нерашучасці».**

Я ТРЫМАЮ ў руках невялікі прадаўгаваты квіток. У яго няма назвы, але гэта не галоўнае. Прабягаючы вачыма па яго радках, многія з якіх маюць наўмысныя пропускі, каб можна было ўпісаць прозвішча, імя, дату і г. д., зноў затрымліваю ўвагу на асноўным: «студэнт... накіроўваецца ў гарадское Бюро па працаўладкаванню...»

— Так, фактычна гэта накіраванне на работу,— гаворыць старшыня штаба працоўных спраў універсітэта Ігар Вярэнчыкаў.— Можна было б сказаць, што разам са з'яўленнем гэтых накіраванняў скончыўся і перыяд дастаткова доўгага непаразумення, які адліваўся вось у такі афарызм: «Студэнт і работа — рэчы несумяшчальныя».

І. Вярэнчыкаў расказаў аб тым, якім чынам ва універсітэце будзе адбывацца працэс працаўладкавання студэнтаў.

Перш за ўсё студэнту, які вырашыў працаваць у вольны ад заняткаў час, патрэбна падаць заяву на імя дэкана факультэта, давёўшы гэта да ведама факультэцкага сакратара камітэта камсамола і старшыні штаба працоўных спраў. Пасля гэтага, атрымаўшы згоду на факультэце, ён павінен узяць у штабе працоўных спраў універсітэта накіраванне ў гарадское Бюро па працаўладкаванню. Інспектары бюро дадуць неабходную інфармацыю па выбранай спецыяльнасці на канкрэтным прадпрыемстве, раскажуць пра ўмовы працы, быту і памер зарплаты.

Уладкаваўшыся на работу, частку квітка накіравання, дзе будзе напісана назва арганізацыі, прыняўшай студэнта, неабходна вярнуць у ШПС універсітэта.

— Вось, па-сутнасці, і ўсе фармальнасці,— звыкла, па ўсім відаць, што не мне першаму растлумачыўшы, як усё будзе адбывацца, падвёў вынік старшыня штаба працоўных спраў.

— Ігар, а чаму з самага пачатку ты заўважыў: «Можна было б сказаць, што скончыўся перыяд непаразумення...»? Чаму такая няўпэўненасць?

— Не, гэта не няўпэўненасць. Проста чыста аб'ектыўных «мінус-фактараў» у такой няпростай справе пакуль што дастаткова. Напрыклад, да гэтага часу не распрацаванымі заканадаўствам застаюцца пытанні з водпускамі і нават сама сістэма аплаты студэнтам. Згадзіцеся, што студэнт на прадпрыемстве — гэта не адно і тое ж, што рабочы на тым жа прадпрыемстве. Тут павінна быць пэўная розніца і ў нарміроўцы, і ў працягласці рабочага дня, і ў пытаннях з тымі ж адгуламі...

— А што б ты параіў у даных умовах?

— Думаецца, што сёння, зрабіўшы адзін крок наперад, патрэбна рабіць і другі. Я маю на ўвазе стварэнне КСА — круглагадовых студэнцкіх атрадаў. Упершыню гэты тэрмін з'явіўся ў Ленінградзе. Чацвёрты год там па ініцыятыве камсамола праводзіцца эксперымент па арганізацыі вытворчай працы студэнтаў у вольны ад вучобы час. У гэтай рабоце прымаюць удзел тысячы юнакоў і дзяўчат. Зараз у Ленінградзе налічваецца 160 КСА. Іх дзейснасць пацвердзілі час і справы. Дарэчы, і заробак у байцоў КСА звычайна вышэйшы, чым у студэнтаў, якія ўладкоўваюцца індывідуальна. Справа ў тым, што на іх ужо распаўсюджваюцца прывілеі СБА. Думаецца, што за КСА — будучае...

**Ч. ВІКТАРАЎ.**

АГЛЯД ВОДГУКАЎ

**Першы год у БДУ імя У. І. Леніна працуе універсітэт музычнай культуры. Нашы студэнты і выкладчыкі на канцэртах-лекцыях знаёмяцца з творамі італьянскага, нямецкага, французскага, англійскага барока («Музыка 300 гадоў назад»), з творчасцю Баха і Моцарта («Да таямніц творчасці»), з музыкай Вівальдзі («Легенда і праўда пра Антоніа Вівальдзі»). Захапляючыя гутаркі музыказнаўцы Беларускай дзяржаўнай філармоніі Міхаіла Сямёнавіча Казініка пройдуць у суправаджэнні Мінскага камернага аркестра, салістаў Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР, Беларускай дзяржаўнай філармоніі, вядучых салістаў Масквы і Ленінграда. У снежні мінулага года прайшло першае пасяджэнне універсітэта («Музыка 300 гадоў назад»), якое, мяркуючы па пісьмоваму апытанню слухачоў, было сустрэта з вялікім энтузіязмам.**

# ПРА ЦУДОЎНАЕ, ВЕЧНАЕ...

...Семдзесят чатыры пісьмовыя адказы на пытанне «Ці спадабаўся канцэрт і ці мэтазгодна працягваць заняткі музычнага універсітэта?»

Зала не пуставала, але свабодных месц хапала. Чаму? Па гэтаму пытанню ўзніклі розныя і часам спрэчныя думкі.

**«Думаю, многія не прыйшлі таму, што не было дастатковай рэкламы. Хаця гэта можа быць хутчэй сумным, а не смешным, што класіка мае патрэбу ў рэкламе»**,— піша аўтар у адной з запісак. Наконт рэкламы можна паспрачацца. Колькасць жа закупленых абанементаў адпавядала колькасці жадаючых. Выказалі жаданне наведаць канцэрт класічнай музыкі дзесяць чалавек на курсе — прадалі ім дзесяць абанементаў. Але факт застаецца фактам: няўжо класіка мае патрэбу ў нейкай расшыранай рэкламе?

**«Прычына таго, што на такія сустрэчы прыходзіць мала аматараў, у тым, што ў патоку падзей мы хочам, каб усё было сіметрычным, стандартным, зразумелым. А так званая «лёгкая музыка» і адпавядае гэтым патрабаванням. У ёй усё проста...».** Магчыма, такі адказ бліжэй за ўсё да ісціны. У дваццатым стагоддзі часта не хапае часу прыслухацца да сябе, пабыць сам-насам з сабой. Але вось парадокс: у тым і каштоўнасць класічнай музыкі, што яна можа нам у гэтым дапамагчы.

Ёсць і іншыя думкі. І іх большасць.

**«Міхаіл Сямёнавіч, Вы самі ведаеце, што на наступныя канцэрты прыйдзе ўдвая больш студэнтаў. Не пакідайце, калі ласка, нас. Зараз Вы належыце ужо не сабе!»**

У водгуках запэўніваюць, што ў наступны раз прывядуць з сабой сяброў, шкадуюць, што ў гэтым навучальным годзе адбудзецца ўсяго тры канцэрты, а не больш.

...Ліецца цудоўная мелодыя, пяе, расказвае, дзеліцца з чалавекам сваімі думкамі, пачуццямі. А ёсць людзі, якія не ведаюць, якое задавальненне можа прынесці класічная музыка! «Не люблю класіку»,— гаворыць нехта. Але не любіць толькі таму, што не разумее, таму што не хоча паспрабаваць зразумець яе. Вельмі шкада мне такіх людзей, хочацца сказаць ім: адкрыйце вочы і вушы, прымусьце вашы думкі шавяліцца хутчэй, паслухайце, паглядзіце, падумайце! Колькі навокал вас цікавага! Для вас гучыць Музыка, кожны з вас можа зразумець, пра што яна гаворыць. Кожны можа зразумець класіку. У гэтым пераканаліся ўсе, хто прысутнічаў на канцэрце 18 снежня.

**«Магчыма, гэта крыху позна, але я пачынаю разумець музыку. Не ведаю, праз які час, але ўпэўнена, што музыка, іменна класічная, будзе для мяне ўсім».**

**«Увесь час сустрэчы правяла ў напружанні — баялася дыхнуць, каб не спужаць у сабе тое, што прачнулася сёння».**

**«Гэта цудоўна — у мітусні, вечнай паспешнасці, занятасці умець спыніцца ў здзіўленні, калі, здавалася б, нічога не здзіўляе, замерці і задумацца, калі, здавалася б, развучыўся ў гэтым. І самае галоўнае, зразумець, што пакуль на свеце ёсць музыка, жыць неабходна».**

**«Музыка прымушае ісці наперад, не пагаджацца, не мірыцца з агіднасцю. Я люблю музыку, ёй невядомыя разлік і карысць».**

Гэтыя выказванні, пачуцці — толькі частка з тых, што ўзніклі ў слухачоў за паўтары гадзіны сустрэчы з самай цудоўнай, проста чароўнай класічнай музыкай.

Знаёмства з класікай у канцэртнай зале неабходна, яно намнога карысней, лепш, чым праслухоўванне твораў па радыё ці пры дапамозе прайгравальніка, магнітафона. Асабліва карысны каментарый і думка музыказнаўцы.

Канцэрты-лекцыі універсітэта музычнай культуры суправаджаюцца цікавымі расказамі М. С. Казініка. У запісках студэнты і выкладчыкі выказвалі сваё зачараванне лектарам. **«Дзякуем Вам, Міхаіл Сямёнавіч, у першую чаргу за неабыякавасць да жыцця. Вы — цудоўны чалавек! Вы здольны пераадолець і слепату, і глухату напамінкам пра цудоўнае, вечнае...».**

**Увага! Сёння, 14 лютага, у 16 гадзін у актавай зале галоўнага корпуса адбудзецца канцэрт-лекцыя «Да таямніц творчасці» (Бах, Моцарт). Запрашаем усіх жадаючых. Наведаеце — не пашкадуеце!**




## НА ВЯСЁЛАЙ ХВАЛІ

* АДНОЙЧЫ вядомы вяльможа з Зальцбурга, радзімы Моцарта, вырашыў пагутарыць з юным кампазітарам, які на той час набыў ужо сусветную славу. Але як звярнуцца да хлопчыка? Сказаць Моцарту «ты» — вельмі многа гонару для... Вяльможа, як яму здавалася, знайшоў кампрамісны варыянт.

— Мы былі ў Францыі і Англіі? Мы карысталіся там вялікім поспехам? — сказаў ён.

— Я сапраўды там выступаў. Аднак вас, здаецца, нідзе раней не сустракаў, акрамя Зальцбурга.

* * *

* ПАСЛЯ СМЕРЦІ Джакома Мейербера, вядомага французскага опернага кампазітара, яго пляменнік звярнуўся да Расіні з просьбай паслухаць створаны ім жалобны марш памяці нябожчыка.

Пасля таго, як аўтар закончыў іграць свой марш, Расіні сказаў:

— Думаю, было б значна лепш, каб дзядзька напісаў жалобны марш у ваш гонар.

* ВЯДОМЫ нямецкі кампазітар і дырыжор Людвіг Шпор прыходзіў на рэпетыцыі сваёй новай араторыі з васьмігадовай дачкой. На працягу ўсяго твора яна сядзела звычайна спакойна, абыякава, але як толькі пачынала іграць фінальная фуга, дзяўчынка прыкметна ажыўлялася. Заўважыўшы такую перамену ў настроі дачкі, Шпор запытаў у яе:

— Табе падабаецца мая фуга?

— Не, тата,— адказала дзяўчынка.— Проста я ўжо ведаю, што калі пачынаецца фуга, то твор набліжаецца к канцу. І значыць, мы хутка вернемся дамоў і будзем абедаць...

# ПАНАРАМА

**НЯДАЎНА споўнілася 15 гадоў работы на эстрадзе вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры». Да свайго юбілею «Песняры» падрыхтавалі праграму «Праз усю вайну», якая заваявала вялікі поспех у слухачоў.**

●●●

**ПЕРШАЕ выкарыстанне сінтэзатара як клавішнага інструмента зафіксавана ў 1969 годзе ў час запісу пласцінкі «Бітлз» «Эбі роуд». Зараз адзін чалавек, асвоіўшы сінтэзатар, з поспехам можа імітаваць гучанне цэлага сімфанічнага аркестра і нават галасоў. Некаторыя мітуслівыя прыхільнікі прагрэсу паставілі пытанне рубам: час адмовіцца наогул ад устарэлых інструментаў. І вось нечаканы ўдар па «электроншчыках»: вакальная група «Флаінт пікетс» запісала песню «Толькі ты», папулярную раней у выкананні сінтэзатарнага дуэта «Язу». На гэты раз партыі сінтэзатараў заменены прыгожымі, чыстымі галасамі. У Англіі песня імгненна паднялася да першага месца ў хіт-парадах, даказаўшы, што добрыя спевы заўсёды ў пашане нават у эпоху электроннага прагрэсу.**

**«КРУІЗ» быў створаны ў 1981 годзе былымі ўдзельнікамі тамбоўскага ВІА «Маладыя галасы». Яшчэ зусім нядаўна «Круіз» іграў «цяжкі рок». Сёння ён працуе над стварэннем «сінтэтычнага» жанра, прымяняючы на канцэртах праекцыйную і лазерную апаратуру, выкарыстоўваючы танцавальныя і цыркавыя нумары. «Круіз» спрабуе тэатралізаваць сваю музыку.**

●●●

**«АРКЕСТР ЭЛЕКТРЫЧНАГА СВЯТЛА» даўно лічыцца адным з папулярных англійскіх ансамбляў, яго кіраўнік Джэф Лін — адным з лепшых аранжыроўшчыкаў, а кожны з інструменталістаў — адным з лепшых выканаўцаў. Здавалася б, чаго яшчэ жадаць? Але музыканты лічаць, што быць «аднымі з» крыўдна. Імкнучыся хоць у нечым стаць «самымі-самымі», яны паспрабавалі сябе ва ўсіх стылях: дыска, рок-н-рол, поп, соул... Рэзультаты не прымусілі сябе доўга чакаць: біяграфія ансамбля, якая выйшла ў Англіі, называецца «Гісторыя самага безаблічнага ў свеце ансамбля».**

# ДА ТАЯМНІЦ ТВОРЧАСЦІ

ІАГАН СЕБАСЦЬЯН БАХ (1685—1750) — вялікі нямецкі кампазітар 18 стагоддзя. Прайшло ўжо больш за дзвесце гадоў пасля смерці кампазітара, а інтарэс да яго музыкі ўсё больш узрастае. Пры жыцці кампазітар не атрымаў заслужанага прызнання. Арыстакратычнаму грамадству не падабаліся глыбіня і сур'ёзнасць твораў Баха. Яго называлі «вучоным» або сумным музыкантам. А царква знаходзіла яго музыку вельмі жывой і чалавечнай, вельмі хвалюючай: царкоўная ж музыка павінна была падаўляць думкі і пачуцці чалавека, весці яго ў нейкі іншы, «незямны» свет.

У пятнаццаць гадоў Бах пачаў самастойнае жыццё. Спачатку пераехаў у Люнебург, а потым у 1708 годзе спыніўся ў Веймары. Тут ён служыў прыдворным музыкантам і гарадскім арганістам. У веймарскі перыяд кампазітар стварыў свае лепшыя арганныя творы.

У 1717 годзе Бах з сям'ёй пераехаў у Кетэн. Тут ён пісаў галоўным чынам клавірную і аркестровую музыку. Пры двары прынца Кетэнскага, куды ён быў запрошаны, не было аргана. У абавязкі кампазітара ўваходзіла кіраўніцтва невялікім аркестрам, акампанаванне спевам прынца і забаўленне яго ігрой на клавесіне. Патрэбна сказаць, што Бах быў лепшым сярод сваіх сучаснікаў выканаўцам на аргане і клавесіне. І калі як кампазітар ён пры жыцці не быў прызнаны, то ў імправізацыях на аргане і клавесіне яго майстэрства было непераўзыдзеным. Без цяжкасці выконваючы свае абавязкі, Бах увесь вольны час аддаваў творчасці. Створаныя ў гэты час творы для клавіра ўяўляюць сабой другую — пасля арганных сачыненняў — вяршыню яго творчасці.

З Кетэна ў 1723 годзе Бах пераехаў у Лейпцыг, дзе заставаўся да канца свайго жыцця. Тут ён заняў пасаду кантора (кіраўніка хору) пеўчай школы. У Лейпцыгу Бах стварыў свае лепшыя вакальна-інструментальныя кампазіцыі: большую частку кантат (усяго кампазітар напісаў каля 250 кантат).

Разам з вялікімі вакальна-інструментальнымі творамі Бах працягваў пісаць музыку для клавіра. Амаль у адзін час з Месай быў напісаны славуты «Італьянскі канцэрт». Крыху пазней Бах закончыў другі том «Добра тэмпераванага клавіра», куды ўвайшлі 24 прэлюдыі і фугі.

Работа Баха — кіраўніка школы пеўчых — прыносіла яму адны непрыемнасці. Сродкі, якія адпускала царква на школу, былі такімі мізэрнымі, што пеўчыя хлопчыкі галадалі, былі дрэнна апранутыя.

Адзіным задавальненнем была творчасць, сям'я. Падрослыя сыны аказаліся таленавітымі музыкантамі. Яшчэ пры жыцці бацькі яны сталі вядомымі кампазітарамі. Вялікай музычнасцю вызначалася Ганна Магдалена Бах, другая жонка кампазітара. Яна валодала добрым слыхам і прыгожым голасам (сапрана). Добра спявала і старэйшая дачка Баха. Таму ў доме часта гучала музыка.

Апошнія гады жыцця кампазітара былі азмрочаны сур'ёзнай хваробай вачэй. Пасля няўдалай аперацыі Бах аслеп. Але і тады ён працягваў ствараць, дыктуючы свае творы для запісу. Смерць Баха прайшла мала заўважанай. Пра яго хутка забыліся...

**Матэрыялы «Камертона» падрыхтавала студэнтка факультэта журналістыкі Алена МАСЬКОВА.**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

Зак. 2237. АТ 13079.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ